ПДАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 1 (30)

■ З першых вуснаў

СПЯВАЙ, САЛДАТ! ТАНЦУЙ!

Адзін з вядучых музычных калектываў краіны — Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл — святкуе свой 75-гадовы юбілей. Створаны напярэдадні Вялікай Айчыннай, у гады ваеннага ліхалецця ён узнімаў баявы дух салдат. Чатыры — пяць канцэртаў у дзень праходзілі пад абстрэламі і бамбёжкамі, у дождж і завею. Сёння ў ваенных артыстаў не менш напружаны графік. Толькі гастрольныя ўмовы нашмат лепшыя: замест пясчаных пляцовак-узгоркаў — вялікія залы, замест сціплых апладысментаў землякоў — гучныя авацыі айчынных і замежных гледачоў.

Сёння славуты калектыў узначальвае выпускнік ваенна-дырыжорскага факультэта пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага, магістр мастацтваў, заслужаны артыст Беларусі, палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ. Ад мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора ансамбля мы і даведаліся, з якімі «песнямі» ідзе па жыцці творчы калектыў і якімі «танцамі» ён жыве сёння.

Начальнік — мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Беларусі Уладзімір ВАРАПАЕЎ.

— Уладзімір Сяргеевіч, вы ўжо на працягу 10 гадоў — за «штурвалам» ансамбля. Узгадайце, якім быў калектыў, калі вы сюды прыйшлі. Наколькі ён змяніўся сёння?

— Гэта якраз тое пытанне, якое мяне хвалюе. Я часта задумваюся: што змянілася, што стала па-іншаму ў гэтым калектыве? Калі я сюды толькі прыйшоў, то ўбачыў творы высокай якасці, але адразу ўзнікла думка, як бы я па-новаму павярнуў гэтую канцэртную праграму. І першае, з чаго мы пачалі,— арганізавалі тур па Беларусі «Табе, Перамога, прысвячаем!» Аб'ездзілі шмат гарадоў, сустрэліся з ветэранамі, працаўнікамі сяла. І стала ўсё ясна: рэпертуар ёсць, ён нядрэнны, але яго трэба мяняць, каб ісці ў нагу з часам. І вырашаць гэтае пытанне пачалі з кадраў. Натуральна, неабходна было прыцягнуць у калектыў моладзь, перайшлі на больш якасны ўзровень выканання твораў, якія ўвайшлі ў «залаты» фонд ансамбля. Усё большую ўвагу сталі надаваць працы з паэтамі-песеннікамі і кампазітарамі. Сур'ёзна заняліся сучаснай харэаграфіяй, вынікам чаго стала стварэнне на базе балета танцавальнай групы «Траекторыя руху».

— Атрымліваецца, што вы абсалютна перагледзелі балетную групу. Балет ансамбля сёння зусім не той, якім мы прывыклі яго бачыць.

— Сапраўды, сёння абсалютна іншы балет, які захоўвае традыцыі і, разам з тым, прыўносіць нешта новае. Калі я бачу тую энергію, якая зыходзіць ад хлопцаў, што танцуюць, то разумею: яны адпавядаюць таму часу, у якім жывуць. Яны выконваюць хіп-хоп, брэйк-данс… І трэба адзначыць, што сёння гэта ўспрымаецца гледачом. Раней юнакам не было дзе сябе рэалізаваць. А тут у іх узнікла магчымасць прафесійна займацца з харэографам. І так у нас з'явіліся танцы «Айчыне служым», «Салдацкая кругавая», «Прызыў-2014»… Галоўная наша задача — паказаць беларускую армію, дзе пануюць энергія, маладосць, энтузіязм, «агеньчык». І танцоры выдатна спраўляюцца з гэтым, выконваючы часам складанейшыя трукі і элементы. Гэта настолькі кранае, што ёсць гледачы, якія прыходзяць, каб паглядзець менавіта на гэтыя танцы.

— У хору, напэўна, не столькі паклоннікаў?

— Памыляецеся! У хор да нас прыйшло таксама вельмі шмат таленавітай моладзі. Мы іх збіралі па ўсёй Беларусі, быццам па крупінках. Прычым шукалі мэтанакіравана, каб яны падыходзілі нам па характары, каб іх задавольвала жыццё артыста, каб яны спраўляліся з цяжкасцямі. А яны, не буду ўтойваць, ёсць у любым калектыве. У нас вельмі шмат канцэртаў, і вытрымаць іх могуць людзі фізічна падрыхтаваныя і маральна ўстойлівыя. Таму людзі павінны любіць гэтую прафесію. Яны павінны разумець, што прыйшлі ў ваенны калектыў. І яны гэта разумеюць. У хоры ансамбля — людзі-аднадумцы, якія выконваюць як сусветную класіку, так і духоўную музыку, шматлікія вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі. На базе хору мы стварылі вакальную групу «Армейскі голас», дзе чатыры юнакі спяваюць армейскія песні.

І ў нашым аркестры з'явіўся міні-калектыў — струнны квартэт, які выконвае салонную прыгожую музыку. Таксама ёсць эстрадна-сімфанічны калектыў, які працуе ў эстрадным стылі. Аркестр акампануе і танцавальнай групе, і хору, і салістам. Гэта ўсе паўнавартасныя творчыя падраздзяленні, высокапрафесійныя і праверанныя часам.

— Хор, аркестр, балет, салісты, якія ўваходзяць у калектыў, напэўна, дазваляюць ствараць разнастайныя па сваім змесце праграмы?

— Безумоўна! Усе нашы канцэрты праходзяць з аншлагам. Асабліва калі выязджаем, а робім мы гэта вельмі часта. У год у нас ад 150 і больш канцэртаў. І ў кожным з іх закладзена наша галоўная задача — выхаванне патрыятычнага духу сярод грамадзян нашай краіны праз песню. Аднак вялікую ўвагу мы надаём і ветэранам. Без песень, прысвечаных ім, не праходзіць ніводнае наша выступленне. Увогуле, Вялікая Айчынная вайна — старонка і нашай гісторыі. Ансамбль сустрэў вайну практычна ў Брэсцкай крэпасці, дзе артысты спявалі для вайскоўцаў. А потым, адступаючы ў раён Смалявічаў, загінулі… Яшчэ шмат гісторый звязана з вайной. У нас гэта ў памяці і ў нашых песнях.

— Вам, як чалавеку ваеннаму, напэўна, нескладана было наладзіць у калектыве дысцыпліну? Які парадак у палкоўніка Варапаева?

— Вельмі строгі. Прычым з першага дня працы ў калектыве. У дысцыпліну шмат укладваецца паняццяў. Гэта і не спазняцца на працу, і ўдасканальваць свой прафесійны ўзровень. Быць з таварышамі ў добрых зносінах — таксама дысцыпліна. Быць ахайным, падцягнутым, разумець і паважаць сваіх кіраўнікоў, выражаць задачы якасна, на высокім узроўні. Куды ні паглядзі — усюды дысцыпліна. Гэта і наша сістэма працы, якая складвалася на працягу доўгага часу. Разам з тым, я заўсёды расказваю, як зрабіў бы, дзялюся вопытам. Ды і самому трэба з'яўляцца прыкладам.

Акадэмічны ансамбль песні і танца чатыры разы быў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, быў адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. У 2007 годзе калектыў атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Музычнае мастацтва», а ў 2008 годзе — дыплом ЮНЕСКА.

Мы заўсёды павінны быць у добрай форме. А па-іншаму і быць не можа: мы — твар Узброеных Сіл. Калі ў юнака завушніцы, папершае, яму трэба будзе іх зняць. Апошнім часам моладзь пачала рабіць «модныя» прычоскі, якія называюцца дрэдамі. І ў такіх выпадках я нічога не кажу, проста прапаноўваю апрануць ім вайсковую форму, паглядзецца ў люстэрка і ацаніць, як яны выглядаюць. Як правіла, да гэтага не даходзіць, бо многія камандзіраў і начальнікаў. Аднак нямала ў нас і прадстаўнікоў грамадзянскага персаналу. У асноўным, калектыў малады. І на іх ляжыць адказнасць — выконваць творы на героіка-патрыятычную тэматыку, якія не кожнаму па сілах. Напрыклад, праспяваць песню Пахмутавай «Паклонімся вялікім тым гадам» так, каб зал устаў, дарагога каштуе. А ў іх гэта атрымліваецца.

— Чаго патрабуе сучасны глядач? Ці прыслухоўваецеся вы да яго?

— А як жа! У зале заўсёды прысутнічаюць розныя катэгорыі людзей: дзеці, дарослыя, моладзь, людзі больш сталага ўзросту. І мы падбіраем такі рэпертуар, каб кожнаму было цікава. Аднак ёсць у нас і творы, якія мы прысвячаем усім. Дапусцім, «Кацюшу» спяваюць ад малога да вялікага. Зараз мы пабудавалі так праграму, што ў нас ёсць тэма Вялікай Айчыннай вайны, тэма Беларусі, тэма сучаснай арміі, класіка,— прычым як айчынная, так і сусветная. Кожная канцэртная праграма ў нас абнаўляецца амаль на 50 працэнтаў. Мы дастаём нешта старэнькае, шукаем нешта новенькае. Гэта можа быць новая аранжыроўка, інструментоўка ці новая падача. Гэта ўсё тое, што рухае калектыў, усё тое, чым мы жывём. У нас сфарміраваны асаблівы рэпертуар, ёсць свая ніша. За гэты час мы навучыліся не толькі чуць і слухаць гледача, але яшчэ і разумець яго.

— Вы заўсёды вылучаліся сваімі тэматычнымі праграмамі. Калі я не памыляюся, яны былі прымеркаваны да пэўных дат. Напярэдадні — 70-годдзе вызвалення Беларусі. Чаго чакаць вашым гледачам?

— Да нас рэгулярна трапляюць лісты, у якіх просяць прыехаць у пэўную мясцовасць з канцэртамі 9 мая і 3 ліпеня, напярэдадні і пасля гэтых дат. І ў нас ужо амаль гатова праграма, якая будзе складзена так, каб захапіць амаль усю гісторыю гэтага перыяду. На першым плане, вядома, будзе прадстаўлена тэма Вялікай Айчыннай вайны. Не абыдземся і без тэмы Беларусі, на якую мы зараз ствараем новыя творы. Абавязкова будуць прадстаўлены нумары, прысвечаныя арміі. З гэтай праграмай мы праедзем па вайсковых часцях і гарнізонах, выступім перад ваеннаслужачымі і членамі іх сем'яў. Не пакінем без увагі абласныя і раённыя цэнтры, паўдзельнічаем у буйных рэспубліканскіх мерапрыемствах.

— Напэўна, няма ў Беларусі месца, дзе б ні гучалі вашы творы… Ведаюць вас і за мяжой. Як усюды паспяваеце?

— Шчыра кажучы, за мяжой мы ўжо даўно не былі. Апошняя наша паездка была ў Польшчу, дагэтуль тры гады мы ездзілі ў Францыю. Вядома, для артыстаў гэта важна. І не толькі для іх, але і для ўсёй краіны: дзякуючы сваёй творчасці мы знаёмілі іншаземцаў з Беларуссю. І дзе б мы ні былі, у наш адрас гучаць толькі цёплыя словы.

Як мы паспяваем? Справа ў тым, што кожны дзень у нас ідзе праца, і, калі патрэбна мабілізавацца, кудысьці паехаць і выступіць, нам дастаткова перагледзець ужо існуючыя творы, выбудаваць іх у лагічным парадку. Хаця не заўсёды ўсё так, як плануеш. Часам на месцах у нас просяць, каб мы выканалі той ці іншы твор. Памятаю, як у Францыі ў нас пыталіся: «А маглі б вы выканаць «Калінку»? Ці «Кацюшу»? Ці свой нацыянальны твор?» Безумоўна! У гэтым плане ў нас няма абмежаванняў. Вельмі любяць за мяжой нашы беларускія танцы, тую ж «Лявоніху». Музыка — інтэрнацыянальная мова, якая не мае межаў. І нам няцяжка, бо мы проста кожны дзень займаемся сваёй любімай справай.

Гутарыла Вераніка КАНЮТА.

Фота з архіва Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

■ Векапомнае

«ПАРТЫЗАНСКАЯ РЭСПУБЛІКА РАСОНЫ»

Споўнілася 70 гадоў адной са шматлікіх карных аперацый нямецка-фашысцкіх акупантаў па знішчэнні партызан і мірных жыхароў Беларусі. Яна называлася «Ота», значылася пад нумарам 105. Для людзей, што нарадзіліся пасля вайны,— гэта ўжо гісторыя. А для тых, хто перажыў вайну, гэта пякучы боль, які вяртаецца зноў і зноў праз дзесяцігоддзі.

Наша лясная вёсачка Абухава, што на Расоншчыне, ужо ў ліпені 1941 года стала «партызанкай». Першымі партызанамі былі акружэнцы. Да іх хутка сталі далучацца мясцовыя жыхары. У жніўні яны арганізавалі ўборку збажыны ў Паляўшчыне (бязлесная мясцовасць каля Дрысы), каб хлеб не дастаўся фашыстам. Мужчыны касілі пшаніцу, а мы, дзяўчаты і жанчыны, жалі, вязалі снапы, зносілі на павозкі. Працавалі і днём, і ноччу. На другі дзень з'явіліся гітлераўцы з дрысенскага гарнізона, пачаўся бой. Два партызаны былі паранены, але збожжа нам удалося вывезці.

У нашай вёсцы заўсёды знаходзіліся партызаны. Адны ішлі на заданні, іншыя вярталіся з іх. Часта суткамі палілася печ, каб наварыць бульбы ці спячы якіх бліноў, а зімой — абсушыць вопратку, абутак. Вяскоўцы дапамагалі партызанам, як маглі. У час «рэйкавай вайны» абухаўцы па заданні партызан разабралі ўчастак аднакалейкі каля Расонаў. Мужчыны развінчвалі і расцягвалі рэйкі, жанчыны зносілі шпалы.

У 1943 годзе карныя экспедыцыі фашыстаў узмацніліся. У дакументах акупантаў раён расонска-асвейскай партызанскай зоны называўся «партызанскай рэспублікай Расоны». Пераўзыходзячыя сілы карнікаў падтрымлівалі танкавыя, артылерыйскія, сапёрныя і іншыя падраздзяленні, авіяцыя. Партызанам усё цяжэй было іх стрымліваць. Насельніцтву давялося хавацца ў лясах. Наша сям'я разам з 9 іншымі сем'ямі пабудавалі зімовы лагер за 4 кіламетры ад вёскі ў балоцістым лесе на востраве (мясцовая назва Смалаўкі).

У другой палове снежня фашыстам удалося адцясніць партызан да апошняй лініі іх абароны па рэках Нішча, Дрыса і далей на поўнач да блізкага ўжо фронту. У вёсцы Роўнае Поле, якую мы называлі «партызанскай Масквой», сканцэнтраваліся падпольныя партыйныя органы, штабы партызанскіх брыгад, перапоўненыя параненымі шпіталі, тысячы жанчын, дзяцей, старых. Каб выратаваць людзей, партыйнае кіраўніцтва і партызанскае камандаванне вырашыла ў ноч на 28 снежня прарваць блакаду і вывесці насельніцтва і параненых за лінію фронту.

27 снежня партызаны сказалі к вечару сабрацца ў дарогу ўсім, хто можа ісці. Мама ўгаварыла мяне пайсці, а сама з іншымі дзецьмі вырашыла схавацца ў Смалаўках. Сабралася мноства народу. Патрабавалася захоўваць абсалютную цішыню. На прыцемках партызаны павялі людзей да ракі Нішча, якая была пакрыта ўмерзлымі ў лёд сплаўнымі бярвёнамі. Пад цяжарам натоўпу лёд у некаторых месцах трэснуў, і бярвенні круціліся на вадзе. На правы бераг я вылезла з мокрымі да локця рукамі, у ботах хлюпала вада. Справа партызаны вялі бой, і над шашой, якую трэба было перабегчы, ляцелі трасіруючыя кулі фашыстаў. Былі параненыя. Ішлі два дні і тры ночы. Быў толькі адзін прывал. 30 снежня па вузкіх мастках фарсіравалі незамерзлую Дрысу і выйшлі да Чырвонай Арміі. Нам дазволілі распаліць вогнішчы, грэцца і сушыцца. Партызаны вывелі за фронт каля 10 тысяч чалавек. Многія засталіся на месцах: не мелі сіл ісці.

Што адбывалася дома далей, ведаю са слоў Марыі Александроўскай, якая была з маёй сям'ёй у Смалаўках. 30 снежня хтосьці пусціў чутку, што карнікі ідуць толькі па вялікіх лясах, бо там размяшчаюцца партызаны і хаваецца насельніцтва. Таму вырашылі вярнуцца ў невялікі лясок каля сваёй вёскі і перачакаць. Уноч на 31 снежня ўсе з лагера перабраліся ў лясок каля Нішчы, які і без таго быў перапоўнены людзьмі, што не змаглі пайсці за лінію фронту. Раніцай 31 снежня карнікі — 16 паліцаяў і 2 немцы з сабакам — па свежых слядах знайшлі прыехаўшых. Людзям загадалі пастроіцца ў шарэнгу. Дзесяцігадовая сястрычка Манечка ішла на расстрэл босенькая, бо намоклыя бурачкі ціснулі ёй ножкі і мама ноччу іх зняла. Маня Васілеўская стала карміць грудзямі немаўля, спадзеючыся, што ў гітлераўцаў не паднімецца рука стрэліць у жанчыну з дзіцем. Памылілася… Маці вялікай сям'і Марыя Якубоўская, шасцёра з якой стаялі ў шарэнзе, страціла прытомнасць і павалілася, што яе і выратавала. Калі інвалід Іван Якубоўскі з 8-гадовым сынам Антонам і Ганна Васілеўская з гадавалым хлопчыкам на руках кінуліся ўцякаць, карнікі з сабакам дагналі іх на хутары Шкорнева і забілі.

Тут былі расстраляны больш за 30 жыхароў вёскі Абухава, з іх — 14 дзяцей, а таксама людзі, што знаходзіліся ў лясочку. У гэты ж дзень гітлераўцы забілі ў лесе сям'ю Яршовых — 10 чалавек. Жывымі спалілі ў пуні сям'ю Карніленкаў — маці і траіх дзяцей, вёску Абухава, якая пасля вайны не адрадзілася.

Падчас аперацыі «Ота» карнікі расстралялі 2 тысячы чалавек, захапілі для вывазу ў Германію больш за 500 чалавек, спалілі 10 вёсак. Забітых абухаўцаў хавалі толькі ў красавіку 1944 года, калі растала зямля і знайшліся сілы выкапаць вялікую магілу і перанесці целы. У 1982 годзе на магіле паставілі помнік. Месца, дзе некалі была вёска, даўно зарасло, магіла аказалася ў балоцістым лесе. А памяць жыве і сёння.

Алена МАРОЗАВА, *г. Мінск*

■ Актуальная навіна

МАЕШ ТРАІХ ДЗЯЦЕЙ? ВЫЗВАЛЕНЫ АД ПРЫЗЫВУ Ў АРМІЮ!

Чарговая папраўка ўнесена ў закон аб праходжанні воінскай службы

Ужо з 21 студзеня беларускія ваенкаматы перастануць прызываць у мірны час на тэрміновую службу і ў рэзерв шматдзетных татаў. Да таго ж атрымаюць ільготу ў выглядзе адтэрміноўкі тыя хлопцы, якія станавіліся татамі двойчы. Адпаведны заканадаўчы акт ужо апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Зараз жа тыя прызыўнікі, якія выхоўваюць трох і больш дзяцей, карыстаюцца правам на адтэрміноўку. Яна падаўжаецца да таго часу, пакуль бацьку не споўніцца 27 гадоў.

Акрамя таго, некаторыя ваенкаматы чакае рэформа. Праўда, закране яна толькі тыя раёны, дзе ў апошнія гады прызываецца ў армію і ставіцца на вайсковы ўлік не так шмат маладых людзей. Пры такім раскладзе мясцовыя ваенкаматы будуць пераўтвораны ў падраздзяленні камісарыятаў, якія знаходзяцца ў іншых раёнах.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Баявая падрыхтоўка

ВЫПРАБАВАННЕ ДЛЯ ХАРАКТАРУ

Абкатка танкам — адно з асноўных практыкаванняў для кожнага салдата ў межах комплексна-кантрольных заняткаў па агульнавайсковых дысцыплінах. Карэспандэнт «Звязды» стаў сведкам таго, як вайскоўцы 72-га Аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў, які размешчаны ў Печах, на адзнаку здаюць нарматыў, які, хутчэй за ўсё, запомніцца ім на ўсё жыццё.

На тактычным полі стаіць гул ад выстралаў і вайсковай тэхнікі. Салдаты ў касках па чарзе ўскокваюць у акоп, страляюць па БМП, кідаюць гранату, хаваюцца ў акопе пад праязджаючай машынай, а пасля зноў атакуюць яе з тылу. Усё здалёк падобна на сапраўдныя баявыя дзеянні, аднак гэта вучэнні, і для бяспекі салдаты выкарыстоўваюць на занятках вучэбную супрацьтанкавую гранату і халастыя патроны. Пасля кожнай спробы кіраўнік на вучэбнай кропцы выстаўляе салдатам адзнакі.

— Галоўныя мэты заняткаў — праверка практычных навыкаў асабовага саставу ў барацьбе з бронеаб'ектамі праціўніка, а таксама выпрацоўка прыёмаў псіхалагічнай устойлівасці пры адбіцці танкаў праціўніка,— тлумачыць **капітан Павел КАЗЛОЎ, камандзір зводнай роты рэзерву 114 школы па падрыхтоўцы прапаршчыкаў і спецыялістаў харчовай службы.** — Падобнае практыкаванне загартоўвае характар салдата. Памятаю, як сам удзельнічаў у абкатцы танкам. Безумоўна, хваляваўся, ці зраблю ўсё правільна, ці справіцца з кіраваннем механік-вадзіцель, але тады, як і зараз, усё было добра.

Андрэй ЦАРЫКАЎ, радавы зводнай роты рэзерву, з усмешкай прызнаецца:

— Напачатку, калі залазіў у акоп, крыху хваляваўся, глядзеў на пясок, думаў аб тым, як машына праедзе над акопам. Галоўным было трапіць дзвюма гранатамі па БМП. Напэўна, выканаў усё нармальна — атрымаў адзнаку «добра».

Тарас ШЧЫРЫ,
Барысаўскі раён.
Фота аўтара

■ Гісторыя аднаго прадмета

ШВЕЙНАЯ МАШЫНКА

Матуля часта расказвала мне пра вайну… Людзі бягуць у лес, уцякаюць ад фашыстаў, ад іх самалётаў, што нізка гудуць над бульбоўнікам, раскідваючы смяротныя бомбы. Мама са мною ў прыполе паўзе па полі ў лес. А ў вёсцы ўжо гараць хаты, свірны, сады — усё было ў агні…

Вядома, я гэтага не памятаю і толькі цяпер разумею: нас магло і не быць…

Памяццю аб тых падзеях з'яўляецца швейная машынка, якую бацька закапаў у садзе: Ён так казаў: «Калі застанёмся жыць, дык будзе як жыць». І праўду казаў. Адразу пасля вайны выкапалі яе, абгарэлую, і вярнулі да жыцця. Гэтая машынка і цяпер стаіць у мяне і займае пачэснае месца разам з іншымі рэчамі.

Яна столькі паслужыла людзям дзякуючы ўмелым рукам маёй мамы! Шыліся буркі, кажухі, паддзёўкі, паліто, галіфэ, кашулі і шмат чаго іншага. Мама была швачкай-самавучкай, сама рабіла выкрайкі і дапамагала людзям, чым магла, а яны — нам, бо бацькі ўжо не было, а мы, дзеці, хацелі есці.

Як скрозь доўгі-доўгі сон, я ўспамінаю дзень Перамогі. Перамогу чакалі ўсе: і малыя, і дарослыя. Каля дзясятка цягнікоў стаяць на нашай станцыі Хальч. Салдаты-пераможцы павыходзілі з вагонаў, бо невядома калі яны паедуць далей — праз дзень ці праз тры. Нязвыклае моцнае «ўра» нясецца далёка-далёка. Казалі, што яно было чуваць у Чэцвернях, Бабоўцах. Тым больш, падтрымлівалася яшчэ стрэламі з вінтовак, пісталетаў, разрывамі ракет, музыкай гармоніка.

Мы з мамай ціхенька выходзім з хаты, слухаем гэтую музыку Перамогі. Мама прытульвае мяне да сябе. А дзесьці ў хаце ўжо стаіць адкапаная швейная машынка…

Ганна ПЛЯХАВА,
Жлобінскі раён